# § 19. Масавая, элітарная, народная культура

**Культура заснавана на традыцыях, стандартах або шэдэўрах?**






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Паняцце «культура» ахоплівае велізарнае мноства з'яў. Адной з тэм, што найбольш часта сустракаюцца пры абмеркаванні сучаснай культуры, з'яўляецца параўнанне масавай і элітарнай культуры.

**Характэрныя рысы масавай культуры.** Масавая культура сфарміравалася даволі даўно, калі ўзніклі культурныя формы, створаныя спецыяльна для забаў простага люду (напрыклад, гладыятарскія баі ў Старажытным Рыме, карнавалы ў сярэдневечнай Еўропе і інш.). Аднак у поўным сэнсе гэтага слова масавая культура з'явілася толькі ў XX ст. Каб культура стала сапраўды масавай, павінны быць выкананы некаторыя ўмовы.

Па-першае, грамадства павінна валодаць сродкамі для шырокага распаўсюджвання культурнай інфармацыі. Значную ролю ў станаўленні масавай культуры адыграла вынаходства кінематографа, радыё, а затым і тэлебачання. Калі ў 1970-я гг. тэлевізар стаў распаўсюджаным бытавым прадметам, магчымасці масавай культуры значна пашырыліся. Вынаходства камп'ютара, а потым з'яўленне інтэрнэту стварыла тэхнічную базу для далейшага паспяховага развіцця масавай культуры.

Па-другое, масавая культура не выпадкова называецца менавіта так: яна разлічана на спажыванне масамі. Маса як сацыяльная і культурная з'ява абвясціла пра сябе ў канцы XIX — пачатку XX ст. Гэтаму спрыяла дэмакратызацыя грамадскага жыцця ў цэлым, пашырэнне адукацыйных магчымасцей, скарачэнне працягласці працоўнага дня і з'яўленне вольнага часу.

**Хто такі чалавек масы?**

Іспанскі філосаф Хасэ Артэга-і-Гасэт у 1930 г. вызначаў масавага чалавека як асаблівы тып чалавека. Ён самазадаволены і самадастатковы, адчувае сябе такім, як усе, і шчаслівы ўсведамляць гэта. Гэта чалавек, які імкнецца рухацца па цячэнні, а не пераўтвараць сябе і жыццё вакол. Ён не стварае культуру, а спажывае яе. Значыць, чалавек масы патрабуе такой культуры, якая не непакоіла б яго, а прыўносіла ў яго жыццё забавы і засцерагала ад складанасцей і супярэчнасцей рэальнага жыцця. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Па-трэцяе, для масавай культуры характэрна ператварэнне аб’екта культуры ў прадукт для спажыўца, які ацэньваецца па эканамічных параметрах (тыраж, колькасць гледачоў ці слухачоў, прыбытак ад рэалізацыі). У гэтым выяўляецца камерцыйны характар масавай культуры. Вялікае значэнне набываюць спецыялісты, якія вывучаюць і адначасова фарміруюць патрэбы масы, ствараюць прадукты масавай культуры. Разам з тым масавая культура можа стварацца і простымі людзьмі. Хатняя гаспадыня, якая напісала кнігу, можа заваяваць шырокую аўдыторыю; дзейнасць блогера з мільёнам падпісчыкаў — гэта таксама праява масавай культуры.

Такім чынам, **масавая культура** — гэта разнавіднасць сучаснай культуры, якая стварае стандартызаваныя прадукты для шырокага спажывання.

**Масавая культура працінае ўсё жыццё грамадства і выяўляе сябе ў самых розных напрамках дзейнасці:**

- у сродках масавай інфармацыі, якія прапануюць нам выбраныя падзеі і ідэі, а таксама іх апісанне і тлумачэнне;
- у масавых забавах і формах арганізацыі вольнага часу (спартыўныя відовішчы, турызм, кіно, коміксы, поп-музыка, камп’ютарныя гульні і інш.);
- у індустрыі фарміравання іміджу і паляпшэння фізічных даных чалавека (культурызм, аэробіка, фітнес, медыцынскія паслугі і фармацэўтычныя сродкі змены знешнасці і да т. п.);
- у масавай вытворчасці прадметаў бытавога спажывання;
- у індустрыі моды. ■

Масавая культура не мае традыцый. Густы, якія выказвае і абслугоўвае масавая культура, такія скарацечныя, што традыцыі не паспяваюць сфарміравацца. Таму ўзоры масавай культуры хутка страчваюць актуальнасць, выходзяць з моды.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Масавая культура культывуе прыгажосць і стварае моду?**



Як вызначаюцца эталоны прыгажосці? Якім чынам узаемазвязаны масавая культура, мода і прыгажосць у наш час?

Назавіце вядомыя вам конкурсы прыгажосці і паказы моды. Сфармулюйце аргументы «за» і «супраць» правядзення такіх мерапрыемстваў. ■

У масавай мастацкай культуры выраблены прадукт павінен вылучацца простай формай (што дазваляе без асаблівага душэўнага напружання ўспрымаць яго), спрошчанымі сэнсамі, вядомымі хадамі, якія паўтараюць сюжэты і тыпажы. Напрыклад, пасля з'яўлення серыі кніг Джоан Роўлінг пра Гары Потэра ўзніклі іншыя творы пра дзяцей, якія валодаюць магічнымі здольнасцямі.

**Ці становіцца літаратурны твор даступным для ўсіх дзякуючы экранізацыі?**











Як магчымасць экранізацыі твораў літаратуры паўплывала на развіццё масавай культуры? Якія сучасныя экранізацыі прапанаваных твораў вам вядомыя? Выкарыстайце памятку для работы з постарам. ■

Якія творы найбольш часта экранізуюць? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Яшчэ адной асаблівасцю масавай мастацкай культуры з’яўляецца выкарыстанне *архетыпаў* — устойлівых культурных вобразаў. Так, вялікая частка масавай культуры пабудавана на архетыпе героя, які змагаецца дзеля выратавання чалавецтва. Не менш папулярны і архетып гераіні — небагатай дзяўчыны з выдатнымі маральнымі якасцямі, якая вымушана шмат і цяжка працаваць, але якую абавязкова чакае прынц на белым кані.

Прывядзіце прыклады персанажаў розных архетыпаў. ■

## Масавая культура — з’ява складаная

| Станоўчыя рысы | Адмоўныя рысы |
|---|---|
| • Адукоўвае масы, прапаноўваючы ім найбольш значныя дасягненні чалавечай культуры ў даступнай форме<br>• Узнімае актуальныя пытанні (напрыклад, пра здаровы лад жыцця, праблемы экалогіі)<br>• Спрыяе зняццю грамадскага напружання | • Спрашчае складаныя грамадскія з’явы і стандартызуе іх успрыманне<br>• Эксплуатуе тэмы эротыкі і гвалту<br>• Стварае ўмовы для маніпуляцый масавай свядомасцю, міфы, ілюзіі |

Як вы лічыце, арыентацыя масавай культуры на камерцыйны поспех з’яўляецца станоўчай або адмоўнай яе рысай? ■

У цэлым масавая культура з’яўляецца своеасаблівай сучаснай энцыклапедыяй жыцця: яна прапануе ўзоры паводзінаў паміж людзьмі, фарміруе ўяўленні пра пажаданы і непажаданы лад жыцця, чалавечыя каштоўнасці. Нават пытанне прэстыжнасці і каштоўнасці любой з’явы культуры вырашаецца тады, калі яно становіцца прадметам масавага попыту. Масавая культура сцірае ўсякія нацыянальныя межы, паказваючы нам, што іншыя, не знаёмыя нам культуры створаны на тых самых асновах, што



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

і наша культура. Гэта спрыяе фарміраванню ў людзей уяўленняў пра супадзенне найважнейшых жыццёвых каштоўнасцей і памкненняў.

**Асаблівасці элітарнай культуры.** У наш час **элітарная культура** (ад франц. *elite* — адборнае, выбранае, найлепшае) уяўляе сабой сукупнасць культурных каштоўнасцей, узораў, якія з-за сваёй выключнасці разлічаны на вузкае кола знаўцаў.

Яна ствараецца людзьмі высокаадукаванымі, якія валодаюць адмысловымі інтэлектуальнымі і творчымі здольнасцямі. Гэта і навукоўцы, і філосафы, і прадстаўнікі творчых прафесій — мастакі, музыканты, пісьменнікі. Пры гэтым і стваральнікам элітарнай культуры, і яе адрасатам першапачаткова з'яўляецца вузкае кола саміх творцаў. Тое, што ствараюць прадстаўнікі элітарнай культуры, адрозніваецца сваімі ўласцівасцямі ад звыклага, ужо ўкаранёнага ў культуры. Толькі з часам творы элітарнай культуры могуць стаць звыклай і натуральнай часткай культуры.

Роля элітарнай культуры ў тым, што яна стварае і захоўвае найважнейшыя сэнсы культуры, якія адлюстроўваюць і агульначалавечыя каштоўнасці, і характэрныя рысы культурнай эпохі.

## Характарыстыкі элітарнай культуры

- Пашырэнне звыклых уяўленняў пра свет і чалавека (гэта можа рабіць і навука ў навуковых адкрыццях і тэорыях, і мастацтва ў новых мастацкіх кірунках, і філасофія, ствараючы новыя філасофскія вучэнні)
- Стварэнне новых ідэй і інтэрпрэтацый, якія раней былі не вядомы культуры (любы вялікі пісьменнік, напрыклад, з'яўляецца першаадкрывальнікам новых сэнсаў)
- Стварэнне асаблівай мовы, нязвыклай і незразумелай для чалавека па-за колам творцаў, што робіць разуменне элітарнай культуры надзвычай складаным і патрабуе падрыхтоўкі да ўспрымання

Па вялікім рахунку, прадстаўнікі элітарнай культуры не ставяць перад сабой мэты быць зразумелымі звонку. Таму кажуць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пра каштоўнасна-сэнсавую *самадастатковасць* элітарнай культуры, якая апярэджвае ўзровень яе ўспрымання большасцю людзей.



*Кадр з фільма «Анастасія Слуцкая» кінастудыі «Беларусьфільм» (рэж. Ю. Ялхоў, 2003 г.)*



*Фрагмент балета «Анастасія» Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь (пастаноўка 2018 г.)*

У чым, на ваш погляд, асаблівасці выяўлення сюжэта і яго ўспрымання гледачамі ў мастацкім фільме і ў балеце? Чаму балет належыць да элітарнай культуры? ■

Прыкладамі элітарнай культуры з'яўляюцца складаныя літаратурныя раманы, кінафільмы жанру арт-хаўс, опера і балет, жывапіс у складаных для ўспрымання стылях (абстракцыянізм, кубізм, сюррэалізм і г. д.).

Элітарная культура з'яўляецца своеасаблівым узорам, выступаючы як крыніца сюжэтаў, вобразаў, ідэй, якія пасля могуць быць адаптаваны да ўзроўню масавай свядомасці. Напрыклад, класічная музыка ў наш час часта паўстае ў электронным варыянце інструментоўкі, творы жывапісу — у выглядзе рэпрадукцый і прынтаў, літаратурныя творы становяцца асновай для стварэння мастацкіх фільмаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

   

Назавіце творы мастацтва, выкарыстаныя ў прапанаваных на ілюстрацыях прадметах.

Якія шэдэўры сусветнага мастацтва найбольш часта тыражуюцца на розных таварах — футболках, блакнотах, парасонах, пеналах, кашальках, пазлах і да т. п.? Пра якія тэндэнцыі ў развіцці культуры гэта сведчыць?

**Народная культура ў сучасным грамадстве.** Шырокае распаўсюджанне масавай культуры выклікае адмаўленне стандартызаванага прадукту і павялічвае цікавасць да сваіх каранёў, да народнай культуры. **Народная культура** — гэта культура, якая ўключае культурныя пласты розных эпох ад глыбокай старажытнасці да цяперашняга часу (казкі, песні, танцы, міфы і легенды, рамёствы, адзенне і інш.), творцам якіх з'яўляецца народ.

Народная культура ахоплівае самыя розныя бакі чалавечага быцця: і ўяўленні пра свет, і спосабы апрацоўкі матэрыялаў, і асаблівасці адносін паміж людзьмі, і рэлігійныя ўяўленні. Народная культура фарміруецца на працягу ўсяго часу існавання народа, назапашваецца і трансліруецца з пакалення ў пакаленне. Народ выступае «калектыўнай асобай», у якой індывіды аб'яднаны агульнасцю культурных сувязяў. Гэта калектывісцкая культура, у якой цяжка знайсці праявы індывідуалізму. У адрозненне ад элітарнай і масавай культуры, дзе аўтар твора вядомы, народная культура *ананімная*, не мае аўтара і складваецца стыхійна на працягу доўгага часу.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне






Пра што сведчыць папулярнасць у інтэрнэце наступных рэсурсаў?

- Рэцэпты страў народнай кухні
- Схемы ўзораў для вышывання арнаменту
- Тэксты абрадавых песень ■

Асаблівасць народнай культуры ў тым, што яе праявы маюць цэласны характар. Напрыклад, вышыты ці намаляваны арнамент не толькі з'яўляецца спосабам упрыгожвання адзення, жылля або бытавых прадметаў, але і ўтрымлівае ў сабе сімвалы, якія лічацца абярэгамі, нібыта дораць сілу, здароўе або поспех. Народны танец, як правіла, таксама меў сімвалічны характар і часта суправаджаў найважнейшыя абрады. Так, беларускі народны танец «Крыжачок» прысвечаны Сонцу: у ім выкарыстоўваюцца танцавальныя фігуры, у якіх узнаўляецца форма крыжа, а крыж — найстаражытнейшы знак сонца.

Як правіла, народная культура — беспісьмовая, у ёй вялікая роля традыцыі. Часта народную культуру апісваюць як *традыцыйную*, гэта значыць культуру, найбольшай каштоўнасцю якой выступае традыцыя, а адной з задач — пастаяннае ўзнаўленне і захаванне традыцыі.




Сэрцам народнай культуры з'яўляецца *фальклор* (англ. *folk-lore* — народная мудрасць) — вусная слоўная і музычная народная творчасць. Гэта песні, танцы, міфы, казкі і паданні. Часам паняцце «фальклор» пашыраюць, уключаючы ў яго не толькі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

вынікі духоўнай творчасці народа, але і матэрыяльныя артэфакты: адзенне, прадметы побыту.

На жаль, калі сыходзяць людзі, якія з’яўляюцца носьбітамі калектыўнай народнай памяці, дык страчваюцца і веды пра сэнсы народнай культуры, прызначэнне традыцыйных прадметаў побыту. Адыходзяць у мінулае і формы арганізацыі міжасобасных сувязяў, характэрныя для традыцыйнай народнай культуры. Разам з тым у сучаснай культуры існуюць як народныя фальклорныя калектывы, якія рэканструююць і выконваюць народныя песні і танцы, аднаўляюць абрады і традыцыі, так і прафесійныя выканаўцы, што актыўна ўключаюць фальклорныя матывы ў сваю творчасць. Народная культура з’яўляецца асновай для фарміравання галоўных каштоўнасцей, прынцыпаў і традыцый сучаснай нацыянальнай культуры.

Адной з рыс беларускай народнай культуры з’яўляецца гумарыстычнае ўспрыманне навакольнага свету, што выяўляецца ў анекдотах, сатырычных творах, святах і г. д.

Не трэба разумець народную культуру як збор архіўных матэрыялаў ці музей. Сучасныя анекдоты, прыпеўкі, дзіцячыя гульні і апавяданні-страшылкі — гэта таксама формы народнай культуры, гарадскога ці дзіцячага фальклору. Пастаяннае ўзнікненне мемаў і гіфак (пацешная інфармацыя, часта візуальная, звычайна на патрэбу дня, якая ўспрымаецца інтэрнэт-супольнасцю як характарыстыка сітуацыі, падзеі, з’явы) дэманструе новы ўзровень функцыянавання народнай культуры. І мемы, і гіфкі — гэта адлюстраванне гумарыстычнага характару сучаснай народнай культуры.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Параўнайце формы культуры. Запоўніце табліцу ў сшытку.

| | Элітарная | Масавая | Народная |
|---|---|---|---|
| **Кім ствараецца** | | | |
| **На чым заснавана** | | | |
| **Зразумеласць і даступнасць твораў** | | | |
| **Аўдыторыя** | | | |
| **Арыентацыя на камерцыйны поспех** | | | |
| **Прыклады** | | | |

2. Як адным словам можна назваць усе тры ілюстрацыі?





Якія выявы можна аднесці да масавай, элітарнай, народнай культуры? Чаму вы так мяркуеце? Як выяўляецца іх узаемасувязь?

3. *Інтэрнэт-мем* — інфармацыя, што падаецца ў той ці іншай форме, як правіла, дасціпная і іранічная, якая спантанна набывае папулярнасць, распаўсюджваецца ў інтэрнэце разнастайнымі спосабамі (праз сацыяльныя сеткі, форумы, блогі, месенджэры і інш.). Мемамі могуць з'яўляцца любыя выказванні, карцінкі, відэа- ці гукарад, якія маюць значэнне і ўстойліва распаўсюджваюцца ў інтэрнэце. Як хутка змяняюцца мемы? Якія прыклады актуальных мемаў вы можаце прывесці? ■

Выканайце міні-праект «Гэты сучасны фолк». Стварыце плэй-ліст з падборкай народных беларускіх песень у выкананні сучасных фолк-гуртоў «Троіца», «Палац», Shuma, «Стары Ольса», Pawa, «Зніч» і інш. Растлумачце паходжанне назваў гуртоў. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне